# ПРАЦА ПАКАЛЕННЯЎ

## НАРЫС ГІСТОРЫІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК



**Аляксандр КАВАЛЕНЯ,**
**дырэктар Інстытута гісторыі НАН Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар**



**Васьмідзесяцігоддзе Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі – гэта не проста вузкапрафесійнае свята, а знакавая дата для нашай краіны. Ад развіцця навуковых даследаванняў у многім залежыць узровень сацыяльна-эканамічнага прагрэсу Беларусі сёння і ў будучым. Таму не будзе перабольшаннем казаць, што юбілей Акадэміі святкуе ўвесь беларускі народ. Вялікае значэнне для развіцця беларускай навукі меў савецкі перыяд яе гісторыі. Важнымі падзеямі ў навуковым жыцці Беларусі сталі адкрыццё ў 1921 годзе Беларускага дзяржаўнага універсітэта і стварэнне ў 1922 годзе буйнога навукова-даследчага цэнтра – Інстытута беларускай культуры (Інбелкульт). Гэта быў правобраз будучай Беларускай акадэміі навук.**

У адпаведнасці з пастановай Цэнтральнага выканаўчага камітэта і Саўнаркама Беларускай ССР ад 13 кастрычніка 1928 года Інбелкульт быў рэарганізаваны ў Беларускую акадэмію навук, урачыстае адкрыццё якой адбылося 1 студзеня 1929 года ў Мінску. Першы склад правадзейных членаў БАН складаўся з 23 чалавек. Гэта былі вядомыя беларускія навукоўцы і грамадскія дзеячы, а таксама дзевяць прадстаўнікоў ад Расійскай Федэрацыі і Украіны. Першым прэзідэнтам Беларускай акадэміі навук стаў вучоны-гісторык, член Бюро ЦК КП(б)Б Усевалад Макаравіч Ігнатоўскі. У складзе БАН у той час працавалі Г.І. Гарэцкі, Д.Ф. Жылуновіч, І.І. Замоцін, В.У. Ластоўскі, І.Д. Луцэвіч (Янка Купала), К.М. Міцкевіч (Якуб Колас) і іншыя.

За прадваенныя гады навукоўцы Акадэміі навук на чале з яе прэзідэнтамі У.М. Ігнатоўскім (1928–1931), П.В. Горыным (1931–1936) і І.З. Суртой (1936–1937) змаглі зрабіць многае для адраджэння і вывучэння нацыянальнай гісторыі, мовы, літаратуры і этнаграфіі. Быў пакладзены пачатак даследаванням у біялогіі, геалогіі, медыцыне, фізіка-матэматычных і хімічных навуках. Працы акадэмічных навукоўцаў былі адзначаны чатырма Дзяржаўнымі прэміямі СССР. Фарміраванне навуковых кадраў, іх рост і развіццё ішлі разам з ростам і развіццём усёй народнай гаспадаркі і культуры рэспублікі. Разам з тым шматлікія навукоўцы сталі ахвярамі неабгрунтаваных палітычных рэпрэсій. У 1937–1938 гадах загінулі прэзідэнты Беларускай акадэміі навук П.В. Горын, І.З. Сурта, акадэмікі Я.М. Афанасьеў, Т.Ф. Домбаль, П.Я. Панкевіч, Б.А. Тарашкевіч і іншыя.

Нягледзячы на панесеныя страты, якія адмоўна адбіліся на нацыянальна-інтэлектуальным і духоўным развіцці ўсяго беларускага народа, ужо да пачатку 1941 года ў Беларусі склалася дзяржаўная сістэма арганізацыі навукі. У яе былі аб’яднаны 26 навукова-даследчых інстытутаў, 15 навуковых станцый, 2 запаведнікі, 3 музеі, 5 іншых устаноў і 16 ВНУ (без настаўніцкіх). Агульная колькасць інтэлектуальных сіл налічвала 2227 чалавек, сярод іх – 27 акадэмікаў і 23 члены-карэспандэнты АН БССР. У навуковых установах працавалі 753 навукоўцы, у тым ліку 48 дактароў і 136 кандыдатаў навук.

Разам з усім беларускім народам айчынныя навукоўцы пераадольвалі суровыя выпрабаванні Вялікай Айчыннай вайны. Некаторая частка беларускіх навукоўцаў была эвакуіравана ў савецкі тыл. На чале з прэзідэнтам АН БССР К.В. Горавым (1938–1947) навукоўцы прымалі актыўны ўдзел у рашэнні пытанняў, звязаных з пашырэннем і павелічэннем сыравінных рэсурсаў краіны, распрацоўвалі новыя тэхналогіі і ўдасканальвалі вытворчыя працэсы, праводзілі даследаванні па павы-

шэнню ўраджайнасці сельскагаспадарчых культур, пашырэнні іх пасеваў. Навуковыя распрацоўкі садзейнічалі ўзмацненню ваенна-эканамічнага патэнцыялу Савецкага Саюза, спрыялі маральна-палітычнай мабілізацыі савецкіх людзей для адпору ворагу.
Больш за 100 супрацоўнікаў Акадэміі актыўна ўдзельнічалі ў барацьбе супраць германскіх захопнікаў на фронце, у партызанскіх атрадах і антыфашысцкім падполлі.
Вайна нанесла АН БССР велізарны матэрыяльны ўрон і незаменныя кадравыя страты. У пасляваенныя гады супрацоўнікам Акадэміі навук на чале з прэзідэнтамі А.Р. Жэбракам (1947) і М.І. Грашчанковым (1947–1951) прыйшлося вырашаць складаныя задачы ўзнаўлення навуковага патэнцыялу.
У 1950–1960-х гадах у Акадэміі паскорана развіваліся фізіка-матэматычныя, тэхнічныя і біялагічныя навукі. Вялікая заслуга ў гэтым належыць прэзідэнту АН БССР В.Ф. Купрэвічу (1952–1969).
Для каардынацыі фундаментальных даследаванняў па тэхнічных, прыродазнаўчых і гуманітарных навуках пры Акадэміі навук Беларусі ў 1953 годзе была створана Рада па каардынацыі навуковай дзейнасці. Значны крок быў зроблены па ўмацаванню матэрыяльна-тэхнічнай базы Акадэміі. Канструктыўную дапамогу ў гэтым, як і раней, аказвала Акадэмія навук СССР.
Узнікненне новых галін народнай гаспадаркі рэспублікі стала штуршком для хуткага развіцця з сярэдзіны 1950-х гадоў фізіка-матэматычных і тэхнічных навук. Гэтаму спрыяў прыезд у Беларусь шэрагу вядомых навукоўцаў з Расійскай Федэрацыі (фізікі Б.І. Сцяпанаў, А.Н. Сеўчанка, М.А. Ельяшэвіч, М.М. Сірота, матэматыкі М.П. Еругін, У.І. Крылоў, цеплафізік А.В. Лыкаў, матэрыялавед В.П. Севярдзенка, спецыяліст у галіне ядзернай энергетыкі А.К. Красін, фізіёлаг І.А. Булыгін, генетык М.В. Турбін і іншыя).
28 красавіка 1962 года пад Мінскам у вёсцы Сосны быў запушчаны атамны рэактар магутнасцю 2000 кВт. Перад беларускімі навукоўцамі адкрыліся вялікія магчымасці для эксперыментальнай дзейнасці па мірнаму выкарыстанню атамнай энергіі. У 1965 годзе быў створаны Інстытут ядзернай энергетыкі (дырэктар – акадэмік А.К. Красін). Пры садзейнічанні навукоўцаў Інстытута атамнай энергіі імя І.У. Курчатава тут пачаліся даследчыя і праектна-канструктарскія работы па стварэнню рэактараў, у якіх атамная энергія пераўтвараецца ў электрычную. Разгарнуліся даследаванні па вадароднай энергетыцы, радыяцыйнай хіміі і радыяцыйнай мадыфікацыі матэрыялаў. У інстытуце сталі атрымліваць вельмі неабходныя для патрэб прамысловасці, сельскай гаспадаркі і медыцыны кароткажывучыя ізатопы.
Адбываліся значныя змены ў размяшчэнні акадэмічных устаноў. Ажно да канца 1950-х гадоў яны знаходзіліся галоўным чынам у сталіцы рэспублікі, выключэнне складалі некаторыя даследчыя станцыі і эксперыментальныя базы. Ужо ў 1959 годзе ў Гомелі адкрыўся філіял лабараторыі трываласці Інстытута машыназнаўства і аўтаматызацыі, а ў 1961 годзе была створана лабараторыя тэхнічнай механікі Інстытута матэматыкі і вылічальнай тэхнікі. На іх базе ў 1964 годзе арганізавалі самастойны Аддзел механікі палімераў, з 1969 года – Інстытут механікі металапалімерных сістэм.
Акадэмічныя навукоўцы істотна садзейнічалі рэалізацыі важных задач развіцця народнай гаспадаркі рэспублікі. Беларускія фізікі не толькі тэарэтычна, але і эксперыментальна пацвердзілі магчымасць атрымання лазернага выпраменьвання на растворах складаных малекул. На гэтай аснове былі створаны першыя ў краіне лазеры.
Важныя навуковыя вынікі былі атрыманы ў фізіцы акадэмікамі Б.І. Сцяпанавым, А.Н. Сеўчанкам, М.А. Ельяшэвічам; у матэматыцы – акадэмікамі М.П. Еругіным, У.І. Крыловым, Д.А. Супрупенкам; у хіміі – акадэмікамі М.Ф. Ярмоленкам, Б.В. Ерафеевым, М.М. Паўлючэнкам, членамі-карэспандэнтамі У.С. Камаровым і М.І. Міцкевічам; у металазнаўстве – акадэмікамі В.П. Севярдзенкам і Я.Р. Канавалавым. Атрымалі прызнанне даследаванні геолагаў – акадэмікаў А.С. Махнача, Г.І. Гарэцкага, К.І. Лукашова, фізіёлагаў – акадэмікаў І.А. Булыгіна, Д.М. Голуба, батанікаў – акадэмікаў В.Ф. Купрэвіча, М.Д. Несцяровіча, М.У. Смольскага, М.П. Томіна.

**КАВАЛЕНЯ Аляксандр Аляксандравіч.**
Нарадзіўся ў 1946 годзе ў гарадскім пасёлку Капыль Мінскай вобласці. Скончыў гісторыка-геаграфічны факультэт Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага. Працаваў на кафедры гісторыі КПСС Мінскага педынстытута. З 1983 па 1991 гады з'яўляўся членам Рэспубліканскага каардынацыйнага савета па распрацоўцы праблем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. З 1996 года – загадчык кафедры айчыннай і сусветнай гісторыі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя М. Танка.
З кастрычніка 2004 года – дырэктар Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Доктар гістарычных навук, прафесар.
Аўтар звыш 300 навуковых і навукова-метадычных прац, у тым ліку 8 манаграфій і 14 вучэбна-метадычных дапаможнікаў.

1929 80 2009



ЗЬВЯЗДА

ПАСТАНОВА

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

аб рэарганізацыі Інстытуту Беларускай Культуры ў Беларускую Акадэмію Навук

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. ЧАРВЯКОЎ

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД

Сакратар ЦВК А. ХАЦКЕВІЧ

Пастанова ЦВК і СНК Беларусі аб рэарганізацыі Інстытута беларускай культуры ў Беларускую акадэмію навук, надрукаваная ў газеце «Звязда»

За вялікія навуковыя дасягненні Прэзідыум АН СССР у 1967 годзе адзначыў акадэміка Б.І. Сцяпанава залатым медалём імя Вавілава, а акадэміка Ц.М. Годнева – прэміяй імя Ціміразева. За значныя навуковыя дасягненні і падрыхтоўку высокакваліфікаваных навуковых кадраў у 1967 годзе Інстытут фізікі АН БССР, а ў 1969 годзе Інстытут цепла- і масаабмену былі ўзнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Навукова-тэхнічная рэвалюцыя дыктавала важныя змены ў тэматыцы навуковых даследаванняў. У акадэмічных арганізацыях разгарнулася дзейнасць па стварэнню матэматычных праграм для ЭВМ, распрацоўваліся праблемы квантавай электронікі, фізікі плазмы, нелінейнай оптыкі. У адпаведнасці з рэкамендацыяй камісіі АН СССР на чале з М.У. Келдышам у 1965 годзе быў створаны Інстытут тэхнічнай кібернетыкі АН БССР.

Значна была папоўнена сетка навукова-даследчых біялагічных устаноў, умацавана іх матэрыяльна-тэхнічная база. Прынятыя меры садзейнічалі больш актыўнаму ўдзелу біёлагаў у развіцці медыцыны, сельскай гаспадаркі, прамысловасці, у разумным выкарыстанні прыродных рэсурсаў і ахове прыроды.

Значныя поспехі былі дасягнуты ў падрыхтоўцы навуковых кадраў. Пачынаючы з 1962 года планаванне падрыхтоўкі навуковых кадраў стала важным элементам дзяржаўнага народнагаспадарчага плану. Адбываўся рост колькаснага складу Акадэміі. Так, у 1960 годзе ў ёй працавала 3,3 тыс. чалавек, у тым ліку 1,4 тыс. (42,4 %) навуковых супрацоўнікаў, 63 дактары (4,5 % усіх навуковых супрацоўнікаў) і 379 (20,7 %) кандыдатаў навук. У аспірантуры вучылася звыш 300 чалавек. Да пачатку 1970 года ў Акадэміі працавала 9 тыс. чалавек, з іх 3,1 тыс. (34,4 %) навуковых супрацоўнікаў, 123 (4 %) дактары і 888 (28,6 %) кандыдатаў навук. У гэты перыяд колькасць аспірантаў павялічылася больш чым у два разы: іх налічвалася звыш 700 чалавек. Асабліва маштабная работа была праведзена па падрыхтоўцы кадраў у галіне фізіка-матэматычных навук. Калі ў пачатку 1950-х гадоў у Акадэміі наогул не было дактароў навук па фізіцы і матэматыцы, то ў 1970 годзе працавала 38 дактароў і 330 кандыдатаў фізіка-матэматычных навук.



Цэлай эпохай у развіцці Беларускай акадэміі навук сталі гады, калі яе прэзідэнтам з'яўляўся М.А. Барысевіч (1969–1987). Вядома, што 1970–1980-я гады характарызаваліся паступальным развіццём усіх сфер дзейнасці Акадэміі навук БССР. На мяжу дзесяцігоддзяў акадэмія выйшла з цалкам сфармаванымі асноўнымі накірункамі навуковых даследаванняў і падрыхтаваным навуковым патэнцыялам.

Ужо на пачатку 1970 года ў мэтах паскарэння навукова-тэхнічнага прагрэсу Прэзідыум Акадэміі навук сумесна з адпаведнымі міністэрствамі і ведамствамі, прадпрыемствамі, вышэйшымі навучальнымі ўстановамі распрацаваў комплекс мерапрыемстваў па развіццю і павышэнню эфектыўнасці фундаментальных і прыкладных даследаванняў, ролі навукі ў вырашэнні найважнейшых народнагаспадарчых праблем; удасканаленню сістэмы вышэйшай адукацыі. Пачалося паскоранае развіццё Акадэміі як комплекснага навукова-даследчага цэнтра, дзе для арганізацыі распрацовак у галіне прыродазнаўчых, тэхнічных і гуманітарных навук канцэнтраваліся навуковыя сілы і сродкі на найбольш важных навукова-тэхнічных напрамках. З саюзнага бюджэту сталі вылучацца ўсё больш значных аб'ёмах асігнаванні на навуковыя даследаванні і капітальнае будаўніцтва, што дазволіла правесці істотныя структурныя пераўтварэнні.

У 1971 годзе ў складзе АН БССР былі адкрыты інстытуты геахіміі і геафізікі, у 1973 – электронікі, біяарганічнай хіміі, фотабіялогіі, у 1975 – мікрабіялогіі, у 1980 – заалогіі, прыкладной фізікі, у 1987 – радыёбіялогіі.

Пачалі працаваць акадэмічныя навукова-даследчыя ўстановы ў абласных цэнтрах рэспублікі, што спрыяла набліжэнню навукі да запытаў практыкі, умацаванню сувязяў новых навукова-даследчых падраздзяленняў з вышэйшымі вучэбнымі ўстановамі. Усё гэта садзейнічала актыўнаму прыцягненню маладых спецыялістаў да заняткаў навуковай працай. Немалаважным з'явілася тое, што ў 1970 годзе было заснавана Цэнтральнае канструктарскае бюро, а ў далейшым было адкрыта яшчэ дзевяць канструктарскіх бюро з вопытнай вытворчасцю. Для інстытутаў хімічнага і біялагічнага профіля стварылі пяць эксперыментальных баз. У гэты перыяд колькасць працаўнікоў Акадэміі падвоілася і дасягнула 17 тыс. чалавек, а дактароў і кандыдатаў навук стала больш у 2,5 раза. Установы Акадэміі штогод прымалі звыш 200 маладых спецыялістаў. У 1970–1980-х гадах склаліся навуковыя школы моваазнаўства, тэарэтычнай фізікі, фізічнай оптыкі і квантавай электронікі, матэматыкі, біяарганічнай хіміі, геалогіі, фізіялогіі, генетыкі, матэрыялазнаўства і іншыя, якія працавалі на сусветным узроўні.

Дзякуючы працам Г.В. Багамолава, К.І. Лукашова, А.С. Махнача былі разведаны буйныя нафтавыя радовішчы Прыпяцкай нафтагазаноснай вобласці Беларусі. Па ініцыятыве і пры актыўным удзеле навукоўцаў Акадэміі была падрыхтавана і выдадзена першая 12-томная Беларуская савецкая энцыклапедыя.

Дасягненні акадэмічных навукоўцаў па шэрагу накірункаў атрымалі прызнанне не толькі ў СССР, але і за мяжой. Вынікі даследаванняў акадэмікаў А.А. Ахрэма, М.А. Барысевіча, В.І. Вацякова, Я.Р. Канавалава, Ф.І. Фёдарава былі прызнаны навуковымі адкрыццямі. За буйныя дасягненні ў культуры, навуцы і тэхніцы Ленінскія прэміі былі прысуджаны М.Я. Мацапуры, М.А. Ельяшэвічу, У.П. Платонаву, М.А. Барысевічу, В.У. Грузінскаму, В.А. Талкачову. Званні Герояў сацыялістычнай працы атрымалі П.І. Альсмік, К.К. Атраховіч (К. Крапіва), Т.В. Бірыч, М.А. Барысевіч, М.П. Яругін, Т.Н. Кулакоўская, В.Ф. Купрэвіч, А.Н. Сеўчанка, Я.І. Скурко (М. Танк), Б.І. Сцяпанаў, Ф.І. Фёдараў. Дасягненні сталых беларускіх навукоўцаў у 1950–1980-х гадах былі адзначаны 30 Дзяржаўнымі прэміямі СССР і 44 Дзяржаўнымі прэміямі БССР. Маладыя калегі сталі лаўрэатамі 14 прэмій ВЛКСМ і 47 прэмій ЛКСМБ.

Распад СССР прывёў да разрыву народнагаспадарчых і навуковых сувязяў, пачалося стыхійнае разбурэнне навукі. Найболей балюча гэты працэс праходзіў на пачатковай стадыі фарміравання беларускай суверэннай дзяржавы, калі Акадэмію навук узначальвалі прэзідэнты У.П. Платонаў (1987–1992) і Л.М. Сушчэня (1992–1997).



Выпрабаванне лазернай устаноўкі. На пярэднім плане – акадэмік Б.І. Сцяпанаў. Верасень 1973 года

Цяжкія эканамічныя, палітычныя і сацыяльныя праблемы дэстабілізавалі навуковы комплекс, які дагэтуль даволі эфектыўна працаваў. Доля расходнай часткі дзяржаўнага бюджэту на навуку знізілася з 7,9 % у 1991 годзе да 0,95 % у 1994-м. Рэзка скарацілася колькасць супрацоўнікаў Акадэміі навук Беларусі. Калі ў 1990 годзе налічвалася звыш 17 тыс. чалавек, то ў 1996-м – каля 10 тыс., у тым ліку колькасць навуковых супрацоўнікаў скарацілася з 5967 да 4412 (з іх кандыдатаў навук – з 2557 да 1994). Істотна паменшыўся прыток маладых навукоўцаў. Калі ў 1991 годзе прыбыло 157 маладых спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, то за чатыры наступныя гады ў штат залічылі толькі каля 100 выпускнікоў ВНУ, у тым ліку ў 1996 годзе – усяго 8 чалавек. Шматлікія акадэмічныя інстытуты

альбо зусім спынілі прыём у аспірантуру і дактарантуру, альбо прымалі толькі ў завочную і мэтавую аспірантуру. Але дзякуючы своечасовай падтрымцы дзяржавы ў большасці навуковых арганізацый атрымалася захаваць дзеяздольнае ядро навуковых калектываў і важнейшыя навуковыя школы. Адной з важных праяў увагі дзяржавы да лёсу Акадэміі навук стала прыняцце Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 15 мая 1997 года «Аб Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», у адпаведнасці з якім яна стала Нацыянальнай акадэміяй навук са статусам вышэйшай дзяржаўнай навуковай арганізацыі Беларусі, адказнай за каардынацыю і правядзенне фундаментальных навуковых даследаванняў у краіне. Удасканаленне нарматыўна-прававой базы спрыяла паступоваму ўзнаўленню ўплыву навукі на развіццё эканамічнага патэнцыялу краіны, сацыяльнай і культурнай сферы, дазволіла



Аўтаматызаваны комплекс плазменнай рэзкі метала ў водным асяроддзі, распрацаваны спецыялістамі навукова-вытворчага аб'яднання «Цэнтр» НАН Беларусі

калектыву навукоўцаў НАН Беларусі на чале з прэзідэнтам А.П. Вайтовічам (1997–2000) больш актыўна і мэтанакіравана ажыццяўляць канцэнтрацыю сіл і сродкаў на прыярытэтных навуковых накірунках.

Аднак сітуацыя ў навуковым асяроддзі заставалася даволі складанай. Праблема была не толькі ў тым, што затрымлівалася выплата зарплаты і значная колькасць навукоўцаў знаходзілася ў неаплочваемых адпачынках. Галоўнае – адбывалася дэвальвацыя каштоўнасці прафесіі навукоўца, зніжаўся грамадскі прэстыж навукі і яе запатрабаванасць. Немалаважным з'ўлялася і тое, што акадэмічнае навуковае асяроддзе губляла сістэму кіравання, страчваліся сувязі з рэальным сектарам эканомікі. Толькі са снежня 2000 года па верасень 2001 года двойчы мянялася кіраўніцтва акадэміі: у гэты час абавязкі прэзідэнта НАН Беларусі выконвалі акадэмікі В.А. Іпацьеў і І.Д. Валатоўскі. Падзенне грамадскага прыстыжу беларускай навукі магло адмоўна адбіцца на фарміраванні нацыянальна-дзяржаўнага светапогляду беларускага народа і ў рэшце рэшт – на будаўніцтве незалежнай Рэспублікі Беларусь. Дзеля выпраўлення становішча загадам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнкі ад 19 кастрычніка 2001 года на пасаду прэзідэнта НАН Беларусі быў прызначаны доктар эканамічных навук М.У. Мясніковіч.

Спадчына яму дасталася, мякка кажучы, складаная. Галоўнае заключалася ў недахопе кадраў, якія б не толькі валодалі неабходнымі навуковымі ведамі, але і былі здольныя арганізаваць у новых умовах навукова-даследчую дзейнасць, наблізіўшы яе да патрэб эканомікі. Вядома, што ні за год, ні нават за два падрыхтаваць неабходных спецыялістаў было немагчыма. І толькі дзякуючы таленту, грамадзянскім і арганізатарскім якасцям М.У. Мясніковіча сітуацыя паступова выпраўлялася. Яго навуковая інтуіцыя, дзяржаўная адказнасць і унікальная працаздольнасць падмацоўваліся выкарыстаннем адміністрацыйнага рэсурсу, патрабавальнасцю, у першую чаргу да сябе, дапамагалі прымаць рашэнні, якія не дазволілі разбурыць навуковую сутнасць акадэмічнай навукі пры ажыццяўленні неабходных арганізацыйных пераўтварэнняў, запатрабаваных часам.

Пераадольваючы аб'ектыўныя і суб'ектыўныя складанасці, акадэмічная навука набліжалася да патрэб рэальнага сектара эканомікі. Умацоўваўся кадравы склад навуковых падраздзяленняў, арганізоўваліся новыя навуковыя структуры. Былі створаны два дзяржаўныя навукова-вытворчыя аб'яднанні: «Хімічныя прадукты і тэхналогіі», «Хімічны сінтэз і біятэхналогіі», а таксама восем навукова-практычных цэнтраў: па біярэсурсах, па бульбаводству і плодаагародніцтву, па жывёлагадоўлі, па земляробству, па матэрыялазнаўству, па механізацыі сельскай гаспадаркі, па харчаванні, міжгаліновы навукова-прак-

тычны цэнтр сістэм ідэнтыфікацыі і электронных дзелавых аперацый, што ў значнай ступені садзейнічала ўмацаванню сувязяў навукі і вытворчасці.
Стварaліся неабходныя ўмовы для прыцягнення ў навуку моладзі. Шмат рабілася для захавання і развіцця навуковых школ, падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі, павышэння кваліфікацыі вучоных і спецыялістаў праз дактарантуру, аспірантуру, саіскальніцтва і магістратуру. З гэтай мэтай была арганізавана дзяржаўная ўстанова адукацыі «Інстытут падрыхтоўкі навуковых кадраў».
Нельга не сказаць аб трансляцыі вынікаў навуковых даследаванняў: гэтаму актыўна садзейнічае выдавецкі дом «Беларуская навука». За гады свайго існавання выдавецтва выпусціла ў свет зборы твораў класікаў беларускай літаратуры М. Багдановіча, Я. Купалы, М. Лынькова, манаграфіі аб жыцці і творчасці Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, М. Гарэцкага, К. Крапівы і іншых пісьменнікаў. Выдадзены фундаментальныя даследаванні ў галіне мовазнаўства і літаратуразнаўства, этнаграфіі і фальклору, мастацтвазнаўства, гісторыі, культуралогіі, сотні тамоў навуковай, навукова-тэхнічнай, медыцынскай, вучэбна-метадычнай і іншай літаратуры. З канца 2005 года выдавецкі дом выпусціў у свет такія фундаментальныя выданні, як «Архітэктура Беларусі» у 4 тамах, збор твораў М. Танка ў 13 тамах, «Гісторыя беларускай літаратуры XI–XIX стст.» у 2 тамах, энцыклапедычны даведнік «Сучасная Беларусь» у 3 тамах. У 2007 годзе выдавецтва прыступіла да выпуску 20-томнага збору твораў Я. Коласа.
У апошні час падрыхтаваны і выдадзены сур'ёзныя працы гісторыкаў, філосафаў, сацыёлагаў, філолагаў. У іх знайшлі адлюстраванне каштоўнасныя аспекты ідэалогіі і бяспекі беларускай дзяржавы, ідэйна-тэарэтычныя прынцыпы дзяржаўнасці ў навейшай гісторыі Беларусі.
У шматлікіх рэгіёнах нашай краіны намаганнямі навукоўцаў НАН Беларусі сумесна з вучэбнымі ўстановамі і мясцовымі органамі ўлады арганізоўваюцца і праводзяцца на высокім навукова-арганізацыйным узроўні рэспубліканскія і міжнародныя навуковыя канферэнцыі, семінары і круглыя сталы, якія атрымліваюць шырокі грамадскі рэзананс, падтрымку і адабрэнне мясцовых жыхароў.



У Аб'яднаным інстытуце энергетычных і ядзерных даследаванняў «Сосны»

Упершыню ў нашай краіне ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі створана і ў канцы 2007 года адчынена унікальная археалагічная навукова-музейная экспазіцыя. За апошнія гады значна ўзрос міжнародны аўтарытэт айчыннай акадэмічнай навукі. Нацыянальная акадэмія навук актыўна развівае навукова-тэхнічнае супрацоўніцтва і плённыя творчыя адносіны з замежнымі партнёрамі. НАН Беларусі прадстаўляе Беларусь у такіх міжнародных навуковых арганізацыях, як Міжнародны навуковы савет, Асацыяцыя еўрапейскіх акадэмій навук, Міжакадэмічная група па міжнародных праблемах, Міжнародная асацыяцыя акадэмій навук, Міжнародны цэнтр навуковай і тэхнічнай інфармацыі, Міжнародны саюз чыстай і прыкладной хіміі, Міжнародны кангрэс тэхнічных таварыстваў па механіцы, Міжнародны цэнтр па цепла- і масаабмену.
У апошнія гады заключаны шэраг двухбаковых пагадненняў аб супрацоўніцтве з акадэміямі навук, а таксама з аналагічнымі ім навуковымі ўстановамі Арабскай Рэспублікі Егіпет, Арменіі, Аўстрыі, Балгарыі, ЗША, Кубы, Чэшскай Рэспублікі, Фінляндыі, Францыі, Германіі, Велікабрытаніі, Індыі, Казахстана, Літвы, Кітая, Рэспублікі Карэя, Македоніі, Польшчы, Расіі, Сербіі, Славацкай Рэспублікі, Славеніі, Украіны, Швецыі і іншых краін. Ажыццяўляюцца дагаворы аб супрацоўніцтве з 76 краінамі свету.





В Институте физики имени Б.И. Степанова НАН Беларуси разрабатывают лазерные технологии нового поколения

Эпахальнай падзеяй не толькі для беларускай навукі, але і ўсяго грамадства стала правядзенне 1–2 лістапада 2007 года ў Мінску Першага з'езда навукоўцаў Рэспублікі Беларусь. На гэтым маштабным форуме, унікальным не толькі для Беларусі, але і для краін СНД, быў праведзены глыбокі аналіз зробленага за апошнія гады ў мадэрнізацыі арганізацыйнай структуры і метадаў кіравання навукова-інавацыйнай дзейнасцю, выпрацавана цэласная сістэма мер, накіраваных на фарміраванне ў нашай краіне эканомікі ведаў.

У дакладзе Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнкі, выступленнях удзельнікаў з'езду на секцыях і пленарным пасяджэнні адзначалася, што сёння створаны неабходныя перадумовы для рашучага павышэння ролі навукі ў сацыяльна-эканамічным развіцці краіны. У прынятай на з'ездзе рэзалюцыі пастаўлены задачы, накіраваныя на павелічэнне ўклада навукі ў эканоміку і павышэнне якасці жыцця грамадзян, сфармуляваны канкрэтныя прапановы па іх рэалізацыі. З'езд засведчыў, што аўтарытэт навукі і яе значнасць у грамадстве вызначаюцца ў першую чаргу практычнай карыснасцю навуковых даследаванняў. У дакументах форума прадугледжана канцэнтрацыя намаганняў навукова-даследчых арганізацый, ВНУ, міністэрстваў і ведамстваў па пашырэнню і ўдасканаленню навуковай і інавацыйнай дзейнасці, выкарыстанню найноўшых дасягненняў навукі, пашырэнню экспарту навукаёмістай прадукцыі, стварэнню спрыяльнага інвестыцыйнага клімату і сістэмы эканамічнага стымулявання, забеспячэнню апераджальнай падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў і навуковых кадраў вышэйшай кваліфікацыі, актывізацыі даследаванняў па ўдасканаленню айчыннай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны і ідэалогіі беларускай дзяржаўнасці, вывучэнню гісторыі і культуры народа.



Выклікі часу патрабуюць, каб навука стала апорай, сапраўдным лакаматывам і забяспечыла паспяховае развіццё ўсяго сацыяльна-эканамічнага комплекса нашай дзяржавы. Таму дзяржаўная падтрымка навукі на сучасным этапе ажыццяўляецца па ўсіх кірунках дзейнасці, дзякуючы чаму створана надзейная аснова для рэалізацыі буйных сістэмных праектаў, якія забяспечваюць неабходную інавацыйнасць ад пачатку даследаванняў да рэалізацыі новай прадукцыі.

Сёння мы маем права ганарыцца шматлікімі дасягненнямі айчыннай навукі. Яскравым паказчыкам поспехаў акадэмічных навукоўцаў з'яўляюцца дзяржаўныя і міжнародныя ўзнагароды.

Так, у 2001–2007 гадах звання «Герой Беларусі» былі ўдастоены акадэмікі М.С. Высоцкі і М.А. Савіцкі, доктар тэхнічных навук П.Л. Марыеў, 15 навукоўцаў НАН Беларусі былі ўзнагароджаны ордэнамі, 18 – медалямі, 13 атрымалі ганаровыя званні, 39 сталі лаўрэатамі Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, 36 адзначаны Ганаровымі граматамі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь і Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, 435 – граматамі і дыпломамі рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, 127 сталі лаўрэатамі прэмій НАН Беларусі і іншых акадэмій навук, 4 акадэмічныя арганізацыі былі занесены на Рэспубліканскую Дошку гонару, 210 распрацовак, выкананых навукоўцамі НАН Беларусі, былі адзначаны медалямі і дыпломамі міжнародных і рэспубліканскіх выстаў. За гэтымі сухімі лічбамі стаіць стваральная навуковая праца тых, хто штодзённа множыць эканамічную і духоўную магутнасць нашай дзяржавы, працягвае мацаваць непарыўную сувязь навуковых пакаленняў.

***

Падводзячы вынік дзейнасці акадэмічных навукоўцаў напярэдадні юбілею, можна з упэўненасцю сказаць, што за 80 гадоў свайго існавання Нацынальная акадэмія навук Беларусі стала буйнейшым навуковым цэнтрам краіны, вядомым сусветнай навуковай грамадскасці, і аказвае сёння значны ўплыў на сацыяльна-эканамічнае развіццё краіны і фарміраванне духоўнага стану грамадства. ■